# ЭТНАЭКАЛОГІЯ І ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА

*канд. культуралогіі В.В. КАЛАЦЭЙ*
***(Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Мінск)***

*Разглядаюцца праблемы і перспектывы развіцця этнаэкалагічных накірункаў ў сістэме вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь, характарызуюцца мэты і задачы этнаэкалагічнай кампаненты адукацыі, пазначаецца яе актуальнасць у кантэксце сучасных грамадскіх працэсаў.*

У апошнія два дзесяцігоддзі дзеячы культуры, педагогі і адміністратары краін Усходняй Еўропы паслядоўна шукаюць шляхі будовы м а д э л і адукацыйнага працэсу на падмурку традыцый мясцовых э т н і ч н ы х к у л ь т у р. Мэта іх дзейнасці - замацаваць у адукацыйным працэсе механізмы перадачы этнаэкалагічнага патэнцыялу свайго народа. Сёння на тэрыторыі Беларусі пражываюць прадстаўнікі каля 100 народнасцей. Па перапісу 1989 года небеларусы складалі 22,2 % насельніцтва краіны (табл. 1) [1, с. 50].

Таблица 1

Этнічны склад насельніцтва Беларусі ў 1989 годзе

| Этнічная прыналежнасць | Колькасць | |
|---|---|---|
| | тыс. чал. | % |
| Беларусы | 7 897 | 77,8 |
| Расіяне | 1 341 | 13,2 |
| Палякі | 417 | 4,1 |
| Украінцы | 290 | 2,9 |
| Яўрэі | 112 | 1,1 |
| Іншыя | 71 | 0,9 |

Прадстаўнікі разнастайных этнічных груп паспяхова існуюць у нас у агульным соцыуме і гэта лічаць паказчыкам гарманічнасці міжэтнічных адносін. Да канца XX стагоддзя, увогуле, ва урбаністычных асяродках панавала небеларуская культура, што было абумоўлена этнічнай структурай насельніцтва гарадоў, дзе беларусы складалі меншасць. Агульныя для Еўропы пачатка XXI стагоддзя тэндэнцыі, якія акрэслілі чарговы ўздым інтарэсу да этнічных каранёў, да сваёй культуры адлюстраваліся і ў статыстыцы этнічнай самаідэнтыфікацыі насельніцтва Беларусі [2, с. 30]. За 10 год (1989 - 1999) беларусамі сталі лічыць сябе яшчэ амаль 3 % насельніцтва краіны (табл. 2).

Табліца 2

Этнічны склад насельніцтва Беларусі ў 1999 годзе

| Этнічная прыналежнасць | Колькасць | |
|---|---|---|
| | тыс. чал. | % |
| Беларусы | 8 159 | 81,2 |
| Расіяне | 1 142 | 11,4 |
| Палякі | 396 | 3,9 |
| Украінцы | 237 | 2,4 |
| Яўрэі | 28 | 0,2 |
| Іншыя | 80 | 0,9 |

Як сведчыць рэчаіснасць, людзі, якія лічаць роднай беларускую мову, збольшага імкнуцца да традыцыйных (этнаэкалагічных) каштоўнасцей, прадстаўленых у беларускай культуры: культ сям'і, павага да ўсіх формаў жыцця, супольнае вырашэнне сацыяльных пытанняў, сацыяльная справядлівасць, павага і шанаванне старэйшых у сям'і і грамадзе, захаванне нацыянальных традыцый як гарантыі стабільнага існавання грамадства.

Забеспячэнне пераемнасці такіх каштоўнасцей – э т н а к у л ь т у р н а е в ы х а в а н н е – *набыццё грамадскакарысных ведаў, уменняў, навыкаў сродкамі пераймання народнай культуры і мастацтва.* Яго адметная рыса – *дакументальная аснова*, таму этнакультурнае выхаванне – дзейнасць, якая грунтуецца на вывучэнні, засваенні і трансляцыі беларускай традыцыйнай культуры як цэласнай грамадска-гістарычнай з'явы, у якой адлюстраваны светапогляд, маральна-этычныя і эстэтычныя каштоўнасці беларускага народа. Самы лепшы спосаб далучэння дзяцей да народных традыцый – гэта развучванне з імі гульняў і побытавых танцаў, расповяды казак, спевы ў фальклорных гуртах і ўдзел у каляндарных абрадах.

У Беларусі напачатку XXI стагоддзя быў пэўным чынам абагульнены рэспубліканскі досвед працы ў гэтым кірунку. Імпрэзы, на якіх адбываўся рэспубліканскі абмен вопытам у галіне этнакультурнага выхавання, з 2002 года ладзіць аддзел народных мастацкіх рамёстваў і фальклору ўстановы адукацыі «Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. З 2003 года аддзел іх ладзіць сумесна з факультэтам традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

На працягу 2002 – 2007 гадоў гэтыя імпрэзы (табл. 3) сталі своеасаблівай «трыбунай» для абмеркавання розных аспектаў дзейнасці па навучанні дзяцей і моладзі асновам беларускай культуры [3, с. 22]. Усе, хто спрычыніўся ў краіне да мэтаў, эстэтыкі, дыдактыкі этнакультурнага выхавання, да праблем яго адаптацыі да сучасных акалічнасцей навучальнага працэсу і творчай практыкі, меў магчымасць падзяліцца з калегамі сваімі набыткамі і паслухаць пра дасягненні і праблемы іншых.

**Табліца 3**

Рэспубліканскія мерапрыемствы
па абагульненні досведа этнакультурнага выхавання ў 2002 – 2006 гады

| Дата | Імпрэза | Удзельнікі |
|---|---|---|
| 20.09. 2002 г. | Рэспубліканскі «круглы стол» па тэме: «Этнакультурнае выхаванне і летні адпачынак дзяцей і падлеткаў» | Школьнікі і моладзь Мінскага, Любанскага р-наў, г. Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі |
| 01.04. 2003 г. | Рэспубліканскі майстар-клас «Традыцыйны побытавы танец як складальнік этнакультурнага выхавання: досвед фальклорных аб'яднанняў паўночнай і цэнтральнай Беларусі» | Школьнікі і моладзь Расонскага, Любанскага, Мінскага р-наў, г. Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі |
| 08 – 09.10. 2003 г. | Рэспубліканскі майстар-клас «Рэспубліканскі эксперыментальны праект "Танцавальны фальклор і дзеці" – эфектыўная адкрытая сістэма этнакультурнага выхавання» | Школьнікі і моладзь Любанскага, Барысаўскага, Мінскага р-наў, г. Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі |
| 14 – 15.04. 2004 г. | Рэспубліканскі «круглы стол» па тэме: «Святы "Сонечнага крыжа" і сістэмнасць працэсу этнакультурнага выхавання дзяцей і падлеткаў» | Школьнікі і моладзь Любанскага, Драгічынскага, Акцябрскага раёнаў, г. Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі |
| 27 – 28.10. 2004 г. | Рэспубліканскі майстар-клас «Пераемнасць беларускай этнафанічнай традыцыі: тэорыя і практыка» | Школьнікі і моладзь Валожынскага, Лепельскага, Мінскага р-наў, г.Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі |
| 30 – 31.03. 2005 г. | Рэспубліканскі «круглы стол» па тэме: «Адаптацыя традыцыйнага строя ў дзіцячым і маладзёжным фальклорным гурце» | Школьнікі і моладзь Любанскага, Барысаўскага, Мінскага р-наў, г. Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі |
| 16 – 17.11. 2005 г. | Рэспубліканскі майстар-клас «Інструментальная этнафонія беларусаў: месца ў адукацыйнай і культурнай прасторы XXI стагоддзя» | Школьнікі і моладзь Драгічынскага, Акцябрскага, Мінскага р-наў, гарадоў Мінска, Рыгі, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Рэспублікі Беларусь |
| 24 – 25.04. 2006 г. | Рэспубліканскі «круглы стол» па тэме: «Правядзенне святаў і фестываляў: пытанні дакументальнай асновы мастацкай творчасці» | Школьнікі і моладзь Мінскага раёнаў, гарадоў Мінска, Вільнюса (Літва), супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі |
| 24 – 26.10. 2006 г. | Рэспубліканскі майстар-клас «Гісторыка-культурныя вытокі традыцыйнай музыкі» | Школьнікі і моладзь Кобрынскага, Мінскага раёнаў, горада Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі |
| 17 – 19.05. 2007 г. | Рэспубліканскі «круглы стол» па тэме: «Ландшафтны код святаў і фестываляў» | Школьнікі і моладзь Любанскага, Мінскага р-наў, гарадоў Мінска, Палангі (Літва), супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі |
| 17 – 19.05. 2007 г. | Рэспубліканская фальклорная школа па тэме: «Традыцыйныя музычныя інструменты ў рэкрэатыўнай і абрадавай практыцы XXI стагоддзя» | Школьнікі і моладзь Мінскага р-на, гарадоў Мінска, Санкт-Пецярбурга, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі |

Як сведчыць наменклатура тэматыкі вышэйпералічаных імпрэзаў, за пяць гадоў у колах спецыялістаў былі разгледжаны і абмеркаваны амаль усе віды і аспекты дзейнасці па этнакультурным выхаванні ў Беларусі. У дыскусіях і выступах удзельнікаў гэтых мерапрыемстваў неаднаразова і шырока абмяркоўваўся досвед суседніх краінаў: Літвы, Латвіі, Расіі, Польшчы. Вынікі абмеркавання публікаваліся ў рэспубліканскіх СМІ і даводзіліся да ведама адказных асобаў з міністэрстваў культуры і адукацыі.

Сярод спецыялістаў, якія ўдзельнічалі ў гэтых мерапрыемствах, на працягу 2002 – 2006 гадоў, было праведзена экспертнае апытанне па праблемах беларускай культуры, якой яны мусяць займацца ў сілу ўласных службовых абавязкаў і ў большасці выпадкаў па прызванні і ў сілу асабістай сацыяльнай пазіцыі.

Усяго ў ім удзельнічала 210 супрацоўнікаў устаноў культуры і адукацыі з шасці абласцей Рэспублікі Беларусь і з горада Мінска. Збольшага гэта кіраўнікі музычных, харэаграфічных, харавых студый і гурткоў, аб'яднанняў па розных жанрах дэкаратыўна-побытавага мастацтва, супрацоўнікі метадычных цэнтраў культуры, спецыялізаваных школ і сярэдніх спецыяльных устаноў сферы культуры і адукацыі, выкладчыкі ВНУ. У час правядзення апытання аналізаваліся прынцыпы і мэты арганізацыі працэсу навучання і выхавання сродкамі народнай культуры. Рэспандэнтам былі прапанаваны шэраг пытанняў (табл. 4), на якія даследчыкі атрымалі наступныя адказы.

Табліца 4

Ацэнка экспертамі эфектыўнасці нарматыўнай падтрымкі дзейнасці па этнакультурным выхаванні ў Рэспубліцы Беларусь

| № пп | Пытанне да групы экспертаў | Адказ (% апытаных) | | |
|---|---|---|---|---|
| | | «так» | «не» | «цяжка адказаць» |
| 1 | Ці ўдзельнічаеце Вы (самастойна ці з калектывам, установай) у комплексных мэтавых праграмах і праектах па захаванні традыцыйнай культуры Беларусі? | 5 | 84 | 11 |
| 2 | Ці карыстаецеся Вы ў сваёй дзейнасці нарматыўнымі дакументамі па ахове помнікаў нематэрыяльнай спадчыны народа (па ахове фальклору, традыцыйнай медыцыны, сямейнай абраднасці, духоўных практык аздараўлення, культур нацыянальных меншасцей) ? | 11 | 69 | 20 |
| 3 | Ці адпавядае, на Ваш погляд, дзяржаўны каляндар нацыянальным традыцыям беларусаў, ладу іх жыцця і прыроднаму цыклу іх ландшафту? | 2 | 94 | 4 |
| 4 | Ці ўведзены элементы этнапедагогікі ў вучэбныя праграмы і планы Вашай установы? | 15 | 79 | 6 |
| 5 | Ці мае дадатковыя крыніцы фінансавання Вашай дзейнасці (спецыяльныя артыкулы выдаткаў на экспедыцыйную, фестывальную, камунікатыўную дзейнасць) адміністрацыя Вашай установы? | 2 | 91 | 7 |

Як бачым, сярэдні паказчык па другім, «адмоўным» слупку (адказ «не») – 83 %. Відавочная незадаволенасць абставінамі сваёй дзейнасці з боку спецыялістаў-выхавацеляў сродкамі этнічнай культуры – сведчанне пэўнага дысбалансу, які сёння мае месца ў пытаннях, звязаных з этнаэкалогіяй тытульнага этнасу Беларусі. Гэта – адчувальнае сведчанне «няўпісанасці» яго культуры ў стандарты дзейнасці дзяржаўных устаноў.

Калі беларуская культура недастаткова прадстаўлена ў дзейнасці ўстаноў сацыяльнай сферы, якія істотна праграмуюць светапогляд будучыні краіны – дзяцей і моладзі, паўстае пытанне: «Што за культура там прадстаўлена?». Як сведчыць мой асабісты досвед, на гэтае пытанне мала хто зможа зразумела, паслядоўна і аргументавана адказаць. Увогуле, увесь сусветны досвед міжэтнічнага суіснавання можна звесці да кароткага, але ёмістага выраза «бацькі гісторыі» Герадота: «Калі дазволіць усім народам на свеце абраць найлепшыя звычаі і паводзіны, то кожны народ, уважліва разгледзеўшы чужыя, абраў бы лепшымі свае» [4, с. 9]. Гэтая простая фраза – сапраўднае крэда этнаэкалогіі. З пункту гледжання логікі, 80 % насельніцтва з беларускімі каранямі павінны мець этнічную культуру, прадстаўленую ў нарматыўных дакументах выхавання іх дзяцей. Сёння мы маем сітуацыю з амаль адваротным паказчыкам. Апытанне – сведчанне ў сярэднім 83 %-най (адказ «не», гл. табл. 4) адмоўнай ацэнкі экспертамі-практыкамі асноўных сучасных нарматыўных складальнікаў этнакультурнага выхавання беларускай культурай у рэспубліцы.

Безумоўна, наўрад нейкая з нацыянальнасцей, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі, сёння цалкам задаволена сітуацыяй са станам развіцця ўласнай культуры. Аднак, як сведчыць аўтарытэтнае меркаванне прафесіяналаў і сітуацыя з культурай увогуле, «парадокс Беларусі» ў тым, што ў найбольш неспрыяльным становішчы ў краіне знаходзіцца этнічная культура менавіта беларусаў. Сапраўды, культуры «этнасаўгасцёў» добра і разнастайна прадстаўлены і запатрабаваны ў першую чаргу ва ўласных метраполіях; а дзе застаецца месца для культуры беларусаў, калі ў сябе на Радзіме яе месца не дэкларавана як след?

Адносна этнаэкалогіі і функцыяніравання вышэйшай школы ў Рэспубліцы Беларусь можна зрабіць наступныя высновы:

1) сёння культурны ландшафт краіны, у першую чаргу, беларускія СМІ, інтэрнэт, вучэбны працэс галіны мастацкай адукацыі занятыя рознымі культурнымі ўзорамі (еўрапейскімі, амерыканскімі, расійскімі, беларускімі) у памерах, якія не адпавядаюць рэальным суадносінам у этнічнай структуры насельніцтва краіны;

2) як сведчыць меркаванне педагогаў-удзельнікаў працэсу этнакультурнага выхавання, сёння існаванне самога гэтага працэсу – а) вынік самаадданасці і энтузіязму асобных педагогаў; б) мецэнатства, прафесійнай дальнабачнасці і актыўнай сацыяльнай пазіцыі некалькіх адміністратараў і прыватных асобаў;

3) калі ўлічыць небяспеку гібрыдызацыі, маргіналізацыі культур розных этнасаў і наступстваў гэтага працэсу для грамадства, трэба а) сур'ёзна вывучаць пытанне пра заканамернасці і перспектывы этна-

культурнага выхавання і этнамастацкай адукацыі; б) уносіць адпаведныя карэктывы ў адукацыйныя стандарты Рэспублікі Беларусь, у першую чаргу ў сферы вышэйшай школы.

ЛІТАРАТУРА

1. Саракаік, І. Беларусазнаўства / І. Саракаік. – Мінск: Веды, 1998. – 284 с.
2. Шахотько, Л.П. Социальная демография. Переписи населения: методология, методика, результаты: пособие / Л.П. Шахотько. – Минск: Бестпринт, 2005. – 104 с.
3. Пладунова, Т. Рухомы фэст «Па святах «Сонечнага крыжа»: сацыяльны запыт і канцэпцыя / Т. Пладунова // Штудыі Рэспубл. сезоннай фальклор. школы / рэд. кал. В. Калацэй (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – С. 22 – 27.
4. Токарев, С.А. История изучения календарных обычаев и поверий / С.А. Токарев // Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: исторические корни и развитие обычаев. – М.: Наука, 1983. – С. 8 – 23.

## НЮАНСЫ ПАЛЯВОЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ НА ПАДЗВІННІ 70 – 80 ГАДОЎ ХХ СТАГОДДЗЯ

***В.К. КАРАТАЙ***
***(Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінск)***

*Падкрэсліваецца тэзіс, што Падзвінне – своеасаблівы этналінгвістычны і этнакультурны феномен, які ўзнік на скрыжаванні розных сацыякультурных вектараў і ўяўляе сабой адмысловую «ружу вятроў». Прыводзяцца факты з асабістага вопыту фальклорнага палявога абследавання Паазер'я ў 70 – 80 гады XX стагоддзя. На аснове матэрыялаў архіва вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору Беларускага дзяржаўнага універсітэта даказваецца жыццяздольнасць сучаснай палявой фалькларыстыкі, падаюцца асобныя ўзоры каляндарна- і сямейна-абрадавай паэзіі, зафіксаваныя ў Верхнядзвінскім раёне, робяцца назіранні за іх паэтыкай.*

Як бы нядаўна ўсё было – / Мой Полацк! Наддзвінне! /
А ўжо і пяцьдзесят прайшло, / Калі я вас пакінуў.
*Пятрусь Броўка.*

Беларускае Паазер'е (Падзвінне) здавён вабіла шматлікіх навукоўцаў-даследчыкаў. Гісторыкаў – як зямля старажытных крывічоў, як зямля нашых славутых продкаў: святароў і ваяроў, безыменных рупліўцаў коласа ды ільну. Літаратуразнаўцаў – як радзіма славутых П. Броўкі, В. Быкава, Р. Барадуліна, А. Вярцінскага, А. Вялюгіна, А. Асіпенкі. Мовазнаўцаў і фалькларыстаў – як своеасаблівы этналінгвістычны і этнакультурны феномен, які ўзнік на скрыжаванні найрозных сацыякультурнных вектараў: цэнтральна-беларускіх (ліцвінскіх), рускіх, балцкіх і ўяўляе адмысловую «ружу вятроў». Гэтым ён цікавы і мне – нараджэнцу Нарачанскага краю, які непасрэдна мяжуе з паўднёва-заходняй граніцай пазначанага арэала, і як літаратуразнаўцу і фалькларысту.

Першы раз мне, студэнту філфака БДУ, давялося ўдзельнічаць у палявых запісах вуснай народнай творчасці ў 1974 годзе падчас вучэбнай практыкі. І гэта была Віцебшчына, а дакладней, Мёрскі раён. Як вядома, такія даследаванні праводзяцца ў стацыянарнай, доўгатэрміновай (ад 2 – 3 месяцаў да некалькіх гадоў) або, як у нашым выпадку, экспедыцыйнай формах. Тэрмін практыкі – два тыдні, але і іх часам было цяжкавата дабыць да канца. Прычын тут некалькі, асноўная ж – адсутнасць належных матэрыяльна-бытавых умоў. Ужо пасля заканчэння ВНУ як выкладчык і кіраўнік студэнцкіх экспедыцыйных груп я даведаўся пра рэальныя выдаткі на палявую практыку alma mater і дзяржавы. Нават з улікам тагачасных цэн лічбы былі непрыемна шокавымі: 10 капеек на суткі кватэрных, 50 – сутачных (харчавых). Праўда, поўнасцю аплочваўся транспарт, аднак толькі «цвёрдыя» аўтобусы і «агульныя» чыгуначныя вагоны. А калі да месца прызначэння курсавалі толькі іншыя, дык даводзілася дабірацца «на пракладных» або даплочваць з уласнай кішэні. Такія вось бугалтарскія парадоксы таго часу (ды, відаць, не толькі таго).

Наступная праблема мела ў большай ступені суб'ектыўны характар. Справа ў тым, што сярод двух метадаў экспедыцыйнага абследавання – куставога і маршрутнага – для ВНУ найбольш прыдатным быў першы, калі група размяшчалася ў адным, больш буйным, уладкаваным у бытавым сэнсе і геаграфічна цэнтральным населеным пункце. Але пры гэтым адказным асобам (існавалі ў тыя часы аддзелы практык) трэба было загадзя здабыць інфармацыю ў мясцовых улад і ўсё з імі ўзгадніць. Мы ж тады, у 1974-м, трапілі ў апорную вёску – асяродак стараверАў-перасяленцаў, якія паставіліся да нас вельмі незычліва і да таго ж не з'яўляліся носьбітамі беларускай фальклорнай аўтэнтыкі.